©ПГУ

# АРХІТЭКТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА Ў ТУРЫСЦКА-ЭКСКУРСІЙНЫМ РАКУРСЕ

***М.К. ШАЎЛІС*, І.У. ВАТКІНС**

Astravechchyna - one of the most beautiful parts of Western Belarus. Belarus has the potential favorable for tourism. Tourism is one of the largest industries in the world economy. Certainly, there is a need to develop a specialized tourism for people who want to study in detail the architectural features of the building of the temple, it is necessary to provide such opportunities. For this purpose, we conducted a study designed route. This is the relevance of the work

Ключавыя словы: архітэктура, храмы, сядзібы, турыстычны маршрут

Беларусь мае выключна багаты прыродны і гісторыка-культурны патэнцыял, спрыяльны для турызму. Турызм з'яўляецца  адной з найбуйнейшых галін сусветнай эканомікі, якія дынамічна развіваюцца і спрабуюць заняць належнае месца ў эканоміцы нашай дзяржавы. У цяперашні час распрацаваны шматлікія турыстычныя маршруты разнастайнай тэматыкі і напрамкаў.

Безумоўна, што ёсць неабходнасць у развіцці спецыялізаванага турызму. Калі чалавек у сілу сваёй захопленасці архітэктурным дойлідствам або прафесійных інтарэсаў хоча падрабязна вывучыць архітэктурныя, скульптурна-дэкаратыўныя асаблівасці храмабудавання, яму неабходна даць такія магчымасці. Менавіта з гэтай мэтай праводзілася даследчая праца, распрацаваны дадзеныя маршруты, складзены фотадаведнік.

Астравеччына – адзін з прыгажэйшых куткоў заходняй Беларусі. Гонарам прыроды раёна з'яўляецца знакаміты ландшафтны заказнік "Сарачанскія азёры". Прыгажосць і адметнасць прыроды рэгіёна аздабляецца помнікамі старажытнага дойлідства [1, с. 21], якія ўражваюць сваёй узнёсласцю і велічнасцю.

Улічваючы асаблівасці архітэктурнай спадчыны Астравецкага раёна былі створаны і распрацаваны спецыялізаваныя турыстычныя маршруты (мал.1), якія дазваляюць пазнаёміцца з гісторыяй некаторых вёсак і храмаў Астравеччыны, падрабязна разгледзець асаблівасці архітэктуры і ўнутранае скульптурна-дэкаратыўнае аздабленне храмаў.

А) 

Б) 

В) 


*Мал. 1.* Схемы спецыялізаваных турыстычных маршрутаў:
а) «Помнікі мураванага сакральнага дойлідства астравецкага раёна»;
б) «Помнікі драўлянага сакральнага дойлідства астравецкага раёна»;
в) «Старадаўнія сядзібы астравеччыны»

Акрамя мураваных культавых збудаванняў на Астравеччыне ацалела некалькі каштоўных помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства. Старадаўнія сядзібы, якія захаваліся да нашых дзён, з'яўляюцца каштоўнымі сведкамі мінулага. На тэрыторыі Астравецкага раёна існавала вялікая колькасць сядзіб, але да нашых дзен захавалася не шмат. Выразнымі прадстаўнікамі з'яўляюцца сядзібы ў Трокеніках, Дубніках. Самай значнай і шырока вядомай у раёне была сядзіба ў Варнянах.

Вынікі работы могуць быць выкарыстаны ў вырашэнні пытанняў і задач па будаўніцтву і рэканструкцыі  сакральнай архітэктуры.

Тэма комплекснага даследвання архітэктурнай спадчыны Астравецкага раёна як турыстычнага здабытка і надалей застаецца перспектыўнай для архітэктурнага і гісторыка-культурнага вывучэння.

**Літаратура**

1. Каталіцкія храмы на Беларусі. Мінск, "Беларуская Энцыклапедыя", 2000. Стар. 21.